**Вучэбная дысцыпліна “Антычная літаратура”**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацый-най праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 – 0232-01 “Беларуская філалогія. Прафілізацыя”: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць<br>Кампанент установы вышэйшай адукацыі<br>Класічны модуль |
| **Кароткі змест** | Антычная літаратура: агульная характарыстыка. Паняцце “антычная літаратура”, перыядызацыя. Асноўныя адметнасці антычнай літаратуры. Паходжанне і віды антычнага эпасу, мастацкія асаблівасці гераічнага эпасу. Гамер: загадка асобы, паэмы “Іліяда” і “Адысея”.<br>Дыдактычны і генеалагічны эпас Гесіёда. “Энеіда” Вергілія. Этапы развіцця і асаблівасці грэчаскай міфалогіі. Паходжанне, віды антычнай драмы, антычны тэатр. Старажытнагрэчаская трагедыя (творчасць Эсхіла, Сафокла і Эўрыпіда). Атычная і новаатычная камедыя (творчасць Арыстафана і Менандра). Рымская драматургія (Плаўт, Тэрэнцый, Сенека). Віды грэчаскай лірыкі класічнага перыяду. Эліністычная паэзія. Лірычная паэзія Старажытнага Рыма.<br>Антычная лірыка. Агульная характарыстыка і класіфікацыя грэчаскай прозы. Асаблівасці і віды антычнага рамана. Антычнае байкапісанне. |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны спецыялізацыі студэнт павінен **ведаць**:<br>- галоўныя літаратурныя напрамкі, плыні, школы і стылі;<br>- літаратурныя жанры, сродкі мастацкай выразнасці;<br>- творчасць буйнейшых аўтараў, класікаў нацыянальных літаратур;<br>- этапныя мастацкія тэксгы;<br>- найбольш значныя заканамернасці сусветнага літаратурнага працэсу.<br>**умець:**<br>- атрыбутаваць мастацкі тэкст з пункту гледжання эпохі яго стварэння, аўтарства, суаднесенасці з тым ці іншым літратурным напрамкам, цячэннем, школай, стылем;<br>- выяўляць і аналізаваць філасофскія, рэлігійныя, палітычныя і іншыя ідэі і канцэпцыі, якія знайшлі мастацкае ўвасабленне ў творах літаратуры;<br>- выяўляць і аналізаваць сродкі мастацкай выразнасці, якія выкарыстоўваюцца аўтарам пры стварэнні літаратурнага твора; **валодаць**:<br>- методыкамі аналізу мастацкага тэксту;<br>- методыкай сістэматызацыі і структурыравання з'яў літаратурнага працэсу.<br>**Патрабаванні да акадэмічнай кампетэнцыі спецыяліста**<br>Спецыяліст павінен<br>СК-12 Арыентавацца ў гісторыі літаратурнага развіцця і ў асаблівасцях літаратурнага працэсу, характарызаваць літаратурныя перыяды і напрамкі, працаваць з тэкстам мастацкага твора, выкарыстоўваючы методыкі аналізу і інтэрпрэтацыі. |
| **Пострэквізіты** | “Тэорыя літаратуры”, “Гісторыя замежнай літаратуры” |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін – 108; аўдыторных гадзін – 52, у тым ліку лекцыйных – 22 гадзін, практычных – 24 гадзін, самастойная кантралюемая работа – 6 гадзін, 3 заліковыя адзінкі. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 2-гі семестр, тэст, залік |